# ПЛЕНАРНОЕ ЗАСЕДАНИЕ

**В. І. Курацёва**
Мінск, МДЛУ

## РЭГІЯНАЛЬНЫЯ ПАРТРЭТЫ ПРАСОДЫІ Ў МАЎЛЕННІ БЕЛАРУСАЎ НА РОДНАЙ І ЗАМЕЖНАЙ МОВАХ (на прыкладзе Мінска-Маладзечанскага рэгёна)

Статья посвящена комплексному экспериментально-фонетическому исследованию, которое выявило совокупность отличительных черт каждого из шести лингвогеографических регионов Беларуси – Гомельского, Полоцкого, Западнополесского, Гродненско-Барановичского, Восточномогилёвского, Минско-Молодечненского – и позволило очертить их просодические портреты в речи студентов-белорусов на родном (белорусском) и иностранном (английском) языках. В более детальном рассмотрении представлен просодический портрет Минско-Молодечненского региона, являющегося зоной нейтрализации территориальной специфики белорусской просодии.

Рэгіянальнае маўленне з'яўляецца адной з найбольш важных разнавіднасцей беларускай мовы, паколькі, уваходзячы сваімі каранямі ў глыбіні стагоддзяў, яно выступае ў якасці асновы мясцовага маўлення карэннага насельніцтва і з'яўляецца фундаментам фарміравання беларускай літаратурнай мовы. З гэтай прычыны даследаванні тэрытарыяльнага маўлення не губляюць сваёй актуальнасці і па сённяшні час. Праблемамі, якія стаяць на парадку дня ў айчынным мовазнаўстве, з'яўляюцца: асаблівасці функцыянавання мясцовых гаворак пад уплывам рускай мовы, вывучэнне рэгіянальнага маўлення ў шырокім параўнальным і сацыялінгвістычным аспектах, раскрыццё яго спецыфікі ў такіх значных лінгвагеаграфічных праектах, як «Лінгвістычны атлас Еўропы» і «Агульнаславянскі лінгвістычны атлас».

Асабліва запатрабаваным у сучаснай лінгвістыцы выступае вырашэнне названых праблем у тэрмінах *рэгіянальнага* класіфікацыйнага звяна [1]. Яго значнасць заключаецца ў тым, што, ў той час, як выкарыстаныя раней характарыстыкі дыялектнага і занальнага члянення губляюць сваю распаўсюджанасць, рэгіянальны крытэрый дазваляе даследаваць такія тэрытарыяльныя асаблівасці, якія не ўваходзяць у пералік вылучаных раней рыс дыялектаў і дыялектных зон. Прадстаўленыя ў працах айчынных навукоўцаў звесткі аб сегментным узроўні, генезісе і групоўцы беларускіх гаворак складаюць фундамент апісання маўлення на розных тэрыторыях краіны і ў XXI стагоддзі адкрываюць перспектыву для працягу распачатай працы ў галіне недаследаванай да гэтага часу *фразавай прасодыі*, неабходнай для структуравання выказвання і перадачы яго семантыкі і прагматыкі [2].

Адлюстраванне супрасегментнага ладу беларускай мовы ў літаратурным вымаўленні было здзейснена ў 80–90-я гг. XX ст. у кампаратыўных даследаваннях Г. А. Мятлюк, Т. В. Паплаўскай, А. Б. Каранеўскай, А. У. Таболіч і іх калег, а таксама пры вывучэнні прасодыі беларускай літаратурнай мовы

акадэмікамі Л. Ц. Выгоннай і А. І. Падлужным. Дадзеныя даследаванні склалі аснову для далейшай распрацоўкі акрэсленага навуковага поля ў *рэгіянальным* аспекце, які заставаўся да гэтага часу неасветленым.

Тэарэтычны аналіз разгледжанай навуковай праблемы дазволіў сфармуляваць рабочую гіпотэзу аб наяўнасці спецыфічных рыс прасодыі ў розных рэгіёнах Беларусі і іх праяўленні ў англійскім вымаўленні беларусаў. На праверку гэтай гіпотэзы эксперыментальным шляхам і быў накіраваны прадстаўлены навуковы пошук. Яго мэтай выступіла выяўленне характарыстык фразавай прасодыі на лінгвістычным ландшафце Беларусі і раскрыццё спецыфікі іх маніфестацыі ў англійскім вымаўленні беларусаў.

У правядзенні эксперымента прынялі ўдзел студэнты факультэтаў замежных моў шасці ўніверсітэтаў Беларусі: ГДУ ім. Ф. Скарыны (Гомель), ПДУ (Полацк), БрДУ ім. А. Пушкіна (Брэст), ГрДУ ім. Я. Купалы (Гродна), МДУ ім. А. Куляшова (Магілёў), МДЛУ (Мінск) – прадстаўнікі Гомельскага, Полацкага, Заходнепалескага, Гродзенска-Баранавіцкага, Усходнемагілёўскага і Мінска-Маладзечанскага моўных рэгіёнаў. На падрыхтоўчым этапе з улікам распрацаваных крытэрыяў з апытаных 307 студэнтаў да запісу маўлення былі запрошаны 154 чалавекі – носьбіты беларускай мовы ва ўзросце 18–22 гадоў, карэнныя жыхары доследных рэгіёнаў. У выніку быў атрыманы эксперыментальны матэрыял працягласцю 22,7 гадзіны гучання, з якога па прапанаваных пяці крытэрыях дзве групы інфармантаў (па 5 вопытных выкладчыкаў беларускай і англійскай моў) адабралі найлепшыя рэалізацыі – 108 запісаў (па 18 для кожнага з шасці рэгіёнаў) чытання тэксту на беларускай і англійскай мовах – урыўка з апавядання М. Твэна «Банкаўскі білет у мільён фунтаў стэрлінгаў».

Апрацоўка матэрыялу ажыццяўлялася метадамі аўдытыўнага, акустычнага і матэматыка-статыстычнага аналізу. Істотнасць выяўленых рэгіянальных адрозненняў была вызначана пры дапамозе трох пацвярджальных эксперыментаў: двух перцэптыўных і аднаго супастаўляльнага з выкарыстаннем матэрыялаў маўлення прадстаўнікоў старэйшага пакалення.

У выніку правядзення комплекснага эксперыментальна-фанетычнага аналізу былі выяўлены адметныя характарыстыкі прасодыі ў шасці рэгіёнах краіны і раскрыты асаблівасці праяўлення тэрытарыяльных рыс ў англійскім вымаўленні беларусаў [3]. Сукупнасць высветленых прыкмет кожнага з рэгіёнаў дазволіла акрэсліць тэрытарыяльныя партрэты прасодыі ў маўленні беларусаў на роднай і замежнай мовах. Супрасегментны партрэт Мінска-Маладзечанскага рэгіёна як тэрыторыі, якую навукоўцы адносяць да зоны фарміравання беларускай літаратурнай мовы [4], будзе прадстаўлены ў дадзеным артыкуле.

Так, адной з найбольш спецыфічных аўдытыўных рыс маўлення ў цэнтральнай Беларусі з'яўляецца дамінаванне меладычных контураў з паступова сыходнымі хвалістымі шкаламі (21,4 %) пераважна ў камбінацыі з узыходнымі тонамі сярэдняй разнавіднасці ў нефінальных сінтагмах і сыходнымі тонамі нізкага рэгістра ў фінальных сінтагмах.

Напр.: ˈ*Роўна ·як і не бы|ло сяб\роў* ¦ *ва* ˈ*ўсім гэтым вя|лікім \горадзе.* || *Ніхˈто не жа|даў уладка|ваць мя·не на \працу,* ≀ … ¦ *джэнтльˈмены пача|лі зада>ваць мне* ¦ ˈ*шмат |розных пы\танняў* ≀ *і* ˈ*хутка да|ведаліся* \ *ўсё пра мя/не…* (падыспытны 47).

На ўзроўні акустычнага аналізу доследны рэгіён характарызуецца найніжэйшым узроўнем ч.а.т. і найвузейшым інтэрвалам рэалізацыі ўзыходных тонаў (0,59 і 0,41 н.а.) (мал. 1).




| | мінімум | максімум | інтэрвал |
|---|---|---|---|
| Гомельскі рэгіён | 0,19 | 0,75 | 0,56 |
| Мінска-Маладзечанскі | 0,18 | 0,59 | 0,41 |
| Узровень значнасці | 0,69 | 0,03 | 0,05 |
| t-крытэрый | 0,41 | 2,51 | 2,36 |
| Крытычны t-крытэрый | 2,26 | 2,20 | 2,31 |

Мал. 1. Прыкметы ўзыходных тонаў
у рэгіёнах з найбольш істотнымі статыстычнымі адрозненнямі

Па названых прыкметах маўленне на тэрыторыі цэнтральнай Беларусі проціпастаўляецца прасодыі маўлення ў Гомельскім рэгіёне, дзе зафіксаваны найвышэйшыя значэнні максімумаў (0,75 н.а.) і найшырэйшы інтэрвал ўзыходных тонаў (0,56 н.а.). Высокую верагоднасць адрозненняў паміж рэгіёнамі па названых прыкметах пацвярджаюць статыстычныя адрозненні ўзроўню значнасці і t-крытэрыя Ст’юдэнта.

Па параметрах інтэнсіўнасці і працягласці Мінска-Маладзечанскаму рэгіёну не ўласцівы адметныя тэрытарыяльныя рысы, што дазваляе канстатаваць наяўнасць сярэдніх велічынь дадзеных параметраў у параўнанні з іншымі гаворкамі.

У цэлым супастаўленне адметных характарыстык прасодыі цэнтральнай часткі Беларусі і астатніх моўных рэгіёнаў дае магчымасць назіраць з’яву нейтралізацыі структурных супрасегментных асаблівасцей у мінска-маладзечанскіх гаворках. Нейтралізацыя ўзнікае па прычыне яе лакалізацыі на перакрыжаванні чатырох напрамкаў распаўсюджвання найбольш адметных лінгвістычных рыс. Кожны напрамак прадстаўляе сабой вектар развядзення моўных рэгіёнаў з максімальным і мінімальным праяўленнем пэўных прасадычных прыкмет, якія падчас праходжання праз Мінска-Маладзечанскі рэгіён набываюць усярэдненыя паказчыкі:

а) Полацк – Мінск – Гомель (характар меладычных змяненняў);

б) Гродна – Мінск – Гомель (амплітуда танальных хістанняў);

в) Брэст – Мінск – Магілёў (спецыфічныя рэдкія элементы мелодыі);

г) Полацк – Мінск – Гродна (тэмпаральныя прыкметы).

На перцэптыўным узроўні Мінска-Маладзечанскі рэгіён характарызуе спакойнае, размеранае гучанне, звычнае для жыхароў Беларусі, пазбаўленае шматлікіх меладычных скачкоў, празмернага зацягвання складоў і слоў, кантрасных паказчыкаў прааналізаваных акустычных параметраў.

Асаблівасці тэрытарыяльнага паходжання ў *англійскім* вымаўленні прадстаўнікоў Мінска-Маладзечанскага рэгіёна раскрываюцца праз 2 рысы – па адной на акустычным і перцэптыўным узроўнях аналізу:

1) сярэдні рэгістр і шырокі інтэрвал ч.а.т. узыходных тонаў;

2) сярэднія паказчыкі дыяпазанальных характарыстык маўлення.

Паказчыкі большасці прааналізаваных прыкмет, якія вылучаюць цэнтральную тэрыторыю Беларусі як зону нейтралізацыі рэгіянальных характарыстык, захаваліся ў іншамоўным вымаўленні ўдзельнікаў эксперымента (мал. 2). Выяўленыя асаблівасці дазваляюць ўспрымаць замежнае гучанне Мінска-Маладзечанскага рэгіёна такім жа спакойным і размераным, як і на роднай мове.




а) беларуская мова б) англійская мова

Мал. 2. Падабенства характарыстык ч.а.т. пачатковых сінтагм у беларускім і англійскім маўленні выхадцаў з Мінска-Маладзечанскага рэгіёна на прыкладзе сінтагм *Ніхто не жадаў уладкаваць мяне на працу ...* і *Nobody wanted to give me work ...*

Такім чынам, праведзенае комплекснае эксперыментальна-фанетычнае даследаванне дазволіла пацвердзіць гіпотэзу і зрабіць вывад аб тым, што функцыянаванне прасодыі на моўнай прасторы Беларусі маркіравана рэгіянальна спецыфічнымі рысамі, якія ствараюць каларытныя партрэты прасодыі ў кожным даследаваным рэгіёне Беларусі. Пранікаючы сваімі каранямі ў глыбіні вякоў, яны ўказваюць на тэрытарыяльную роднасць пакаленняў, праяўляюць сваю якасную устойлівасць і захоўваюцца ў іншамоўным вымаўленні беларусаў.

ЛІТАРАТУРА

1. *Даніловіч, М. А.* Рэгіянальныя моўныя з'явы ў класіфікацыйнай сістэме беларускіх гаворак / М. А. Даніловіч // Дыялекталогія і гісторыя беларускай мовы : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 15–16 крас. 2008 г. – Мінск : Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа НАН РБ, 2008. – С. 11–16.
2. *Поплавская, Т. В.* Коммуникативный аспект формообразующих элементов просодии и эффективность речевого общения / Т. В. Поплавская // Актуальные проблемы коммуникативной фонетики и вопросы эффективности общения : материалы Междунар. конф., Минск, 29–30 мая 1997 г. / МГЛУ ; сост. : Л. Т. Выгонная, Т. В. Поплавская. – Минск : МГЛУ, 1997. – С. 3–9.
3. *Курацёва, В. І.* Рэгіянальныя характарыстыкі беларускай прасодыі і іх праяўленне ў англійскім вымаўленні беларусаў : дыс. … канд. філал. навук : 10.02.20 / В. І. Курацёва ; МДЛУ. – Мінск, 2016. – 211 л.
4. *Вайтовіч, Н. Т.* Да пытання аб фарміраванні нацыянальнай літаратурнай беларускай мовы : аб суадносінах літаратурнай мовы і дыялектаў / Н. Т. Вайтовіч. – Мінск : АН БССР, 1958. – 47 с.

The article is devoted to the complex experimental-phonetic study which has revealed distinctive prosodic portraits of six Belarusian regions in the native and foreign language speech of Belarusian students. The article presents a more detailed prosodic portrait of Minsk-Molodechno region, which is the neutralization zone of the territorial Belarusian prosody.

**Ю. В. Бекреева**
Брест, БрГУ

# ТЕОРИЯ ПРОТОТИПОВ В ИССЛЕДОВАНИИ ГЛАГОЛЬНОЙ СЕМАНТИКИ

Статья раскрывает основные положения теории прототипов и определяет перспективы апробации данных положений в исследованиях, посвященных проблемам определения глагола как части речи, категоризации глагольного лексикона и «скрытых категорий» в структуре глагольного значения.

Теория прототипов признана одной из важнейших достижений когнитивной лингвистики, хотя впервые она была сформулирована в рамках экспериментальной психологии. Основоположником теории прототипов признается Э. Рош. Над развитием идей прототипической модели категоризации явлений действительности, психологических и языковых фактов работали Б. Берлин, П. Кей, У. Тейлор, В. Лабов, С. Б. Мервис, Э. Смит, Д. Гиръертс, П. Ньюман, Д. Джонсон, Дж. Лакофф и целый ряд других исследователей. Как и любая перспективная концепция, теория прототипов уточнялась и дополнялась как автором, так и ее последователями, и стала неотъемлемой частью исследований естественных языковых категорий на различных уровнях лингвистического анализа. В данной статье теория